# НА ЗАЛАТЫМ ГАНКУ

## *РУСКІ ДЗЁННІК*

### РАЗАНСКАЯ БЯРОЗКА

Пераблытаць можна год, стагоддзе,
Калі хто з Масквой пасябраваў.
А Разань заўсёды з ёй у згодзе –
На адзін матыў ім лёс спяваў.

Край разанскі… Слаўны ён майстрамі
На будоўлі, ворыве, жніве,
За сталом святочным галасамі.
Тут душа Расіі скрозь жыве.

На раўніне рускай, ля бярозы,
Там, дзе Цна малюе віражы,
У шаўковых травах спеюць росы,
Месяц шлях табе наваражыў.

Дом бацькоўскі вокнамі ў даліну,
Дзе лугі, палі, лясы і Цна.
Там збірала горкую каліну,
Ад усіх хвароб была яна.

На сунічнай сонечнай паляне –
Чырвань ягад. Глянь, як налілі!
Кукавала лета твайго рання,
Бесклапотныя мільгалі дні.

Крок за крокам вобмацкам ад брамы
Са смяшынкай у вачах ішла.
Чула, дзесь бушуюць акіяны,
А ты толькі Цну пераплыла.

Шматгалоссе берагоў дзяцінства
Калыхала мудрая рака.
Тут лугоў расквечаных гасцінства,
З лустай хлеба кубак малака.

Падаіць на выгане карову
У спякоту летняю парой!
З малака галоўнае здароўе
Для басоты нашай залатой.

Прад вачыма вось рагуля тая:
Вымя з поля важкае нясе,
Малако па кроплі ў пыл губляе –
Гаспадар з каровай у сяле.

Пад вятрамі тонкая галінка
Падрасла да восені крыху.
Як да твару стала ёй хусцінка!
Паказаццца час і жаніху.

Каралева рускага прыволля –
Мара ўсіх бярозак, да адной.
Як знайсці сцяжынку ў наваколлі
Да кароны запаветнай той.

Льецца лён валос тваіх духмяных:
Промні сонца фарбавалі іх,
У заранках мыла палымяных,
У туманах завіла густых.

Салаўі пяшчотай сэрца рвалі.
Смак які калодзежнай вады!
Гэта фарбы рускай пастаралі,
Дзе дзяцінства бегалі сляды.

Спадзяваннем стаць усёй Расіі
Родны край табе наканаваў.
Травы, дрэвы, птушкі галасілі,
Калі твой караблік адплываў.

Марыць Цна дайсці да акіяна.
Перад ёй – разбег, прасцяг без меж.
Але ў хвалях, чуеш, запытанне:
– Ты куды свой пáруснік вядзеш?

Колькі лёсаў рвецца да прычалаў…
Быў бы вецер толькі ў парусах.
На ўвесь свет душа твая крычала,
Пакідаючы разанскі шлях.

Ты цяпер з маскоўскаю прапіскай.
Сорак год – наперадзе жыццё.
На сталічным подыуме слізка,
Гэта для цябе не адкрыццё.

Святы лік глядзіць у свет пакорна,
У вачах расійскі эпатаж:
Пад нагамі – царская карона
І «стрыжоў» вышэйшы пілатаж.

У віхуры часу і гісторый
Шлях не ўсе знаходзяць караблі.
Ты ў крутым не збочыла заторы,
І дачкі дзве ў доме падраслі.

Не знайсці мадонну з лёгкай доляй.
Нараджаюць без кароны ўсе.
Толькі б хлебнае спявала поле
У сярэдне-рускай паласе.

2008

КІНЕШМА
Паэма

1
Пяць гадзін ад Масквы – далячынь.
Па шашы на машыне, дык блізка.
Я прыехаў у царства жанчын
Па дарозе іванаўскай слізкай.

Я – у Кінешме. Зімні матыў…
Тут жартуюць мароз і завеі.
Снегапад так пейзажы скрывіў,
Што згубіла вясна зноў надзеі.

Напярэдадні Белгарад сніў.
Твар зямлі там дажджы ўжо адмылі.
Жаўрукі, песняры хлебных ніў,
У нябёсах канцэрты адкрылі.

Тут жа ў Кінешме – гурбы кругом.
Сакавік на хвіліны дзень росціць.
Ён вясну надзяляе святлом.
"Цеплыні, цеплыні!" – зямля просіць.

Красавік дол напоіць вадой.
Май вясёлкай прастор пафарбуе.
А пакуль вясны звонкі настрой
Сябраваць з капяжамі спрабуе.

Згодзен горад аддаць снягоў груз.
Ён расхрыстаны, дзесьці набожны,
Як і ўся праваслаўная Русь.
Тут не менш стала кнопак трывожных.

Мост праз Волгу, як стужка, прайшоў.
Стрэлы кранаў – над купалам сінім.
Горад помніць яшчэ рачнікоў
І тэкстыльную славу Расіі.

Стары катэр пачуў крыгаход…
Абганяе ён поступ прыроды.
З калаўротам выходжу на лёд,
На мармышку шукаю прыгоды.

Дык ці трэба ж уражанняў больш,
Нібы імі жыццё вымяраю?
Заўтра лыжы, наварысты боршч.
Што яшчэ я ад Волгі чакаю?

2
Я курортны раман тут пішу.
Волга ціха старонкі гартае.
З ёй душа мы жывём у душу –
Лёсу кніга мая залатая.

Прыняла гераіня сюжэт.
Цяпер зместам яго напаўняю.
Лазня будзе, басейн. І санет
Над вячэрняй ракой прачытаю.

На спатканне да Волгі, касцёр –
У любое надвор’е. Не спіцца.
Крыж, на лесвіцы стромка – шацёр:
З зямлі б’ецца святая крыніца.

Акунуцца ў сцюдзёнай вадзе
Дзеля веры – зайздроснейшы ўчынак.
Спадяванні гартуюць людзей,
Узвышаюць хлапцоў і дзяўчынак.

Не грыбная пара на двары,
Да Астроўскага, знаць, не паеду.
Пладавіта тут бавіў стары
У лясах вечары – па суседству.

Гэтак мудра не кожнаму жыць
У каханні, у працы, у дзецях.
Хто навучыць людзей даражыць
Тым, што крочаць яны па планеце.

Не прыбіла на волжскі прычал,
Падсумоўваць свой шлях яшчэ рана.
І дзевяты няўрымслівы вал –
Нам бальзамам на старыя раны.

Спрасаваны гадзіны і дні.
Тыдзень наш будзе іншаму годам.
Паспрабуй ты яго разгарні –
Вышыню, цеплыню, асалоду.

Трэба ж з зоркамі шлях узгадняць.
Каб унукам аддаць шар стракаты,
Сувязь з космасам нельга парваць.
Я паэзіі – вечны араты.

3
У тэатры – прэм’ера. Даюць
Вадэвіль на мясцовую тэму:
У правінцыі дамы жывуць,
Хто ж ім тут прынясе дэадэму?

Вось і мараць дзяўчаты пра край,
Дзе вітрыны гараць магазінаў,
Дзе шампанскае. Казачны рай –
Падавайце хутчэй лімузіны!

Наш аўто з гераіняй – танней.
Не, на зорны маршрут яна згодна.
У чаканні яго халадней
Сталі вочы. А позірк лагодны.

Дзяцей росціць чужых яе муж.
Дзе зламалася шчасця былінка?
Іх каханне пад квеценем руж
Было песняй прыволжскай глыбінкі.

Даравала сабе і яму
Недавер, скрыжаванне гісторый.
Аргументы былі за – бяду.
Трэба крочыць адной у гуморы.

Розум згодзен, ды боль за дачку:
Як вучоба, каханне, спатканні.
Не згубіла б на бабскім вяку
На калыску з дзіцём спадзяванні.

Мацярынства люляе жыццё.
Ці ёсць большая тайна ў прыродзе?
Лёс жанчыны – яе адкрыццё.
А натоўп з гэтай думкай не згодзен.

Шчасцем свеціцца твар малады.
Басурманін вядзьмарыць-чаруе
І білет выдае залаты –
Тэлевізар статут гарантуе.

За рэкламным фасадам – тупік.
Адкупіцца – зарплата малая.
Затанцуюць дзіця без улік.
І дачка па панэлі гуляе.

Мак чырвоны прыгожа цвіце,
Калі гэта не злая забава.
Трохвугольнік тады на красе
Ляжа плямаю чорна-крывавай.

Ён растопіць сумоту, нуду
І рамонкавы ціхі світанак.
І прымусіць скакаць на груду,
Пад якім пахаваны рамантык.

У арабскай пустыні тавар
Спадзяецца вярнуцца ў марозы.
Ды да кроплі расплача гандляр
Рускай маці, нязбыўшайся, слёзы.

4
Таямнічыя струны вясны
Так настойліва сонца гукаюць.
І насустрач яму вестуны
Насцеж неба блакіт расчыняюць.

Лес далёкі ад думак святлей.
Гарызонт і празрысты, і чысты.
Вечары запрашаюць людзей
Пад шацёр свой ружова-агністы.

Сок адтайвае ў чэраве дрэў,
Патрывожыў лагодна пупышкі.
Гай вірыць: – Наш фасон састарэў,
На праталіны мода і шышкі.

Вербам дрэвы зайздросцяць: яны –
Прыгажуні ў пушыстых маністах –
Пачалі праменад веснавы
На марозных  падмостках іскрыстых.

У бярозак штодня вернісаж.
Іх аўтографы рвуць з маладосці.
Чым бялей на ствалах макіяж,
Снег чарнее ўсё болей ад злосці.

У грачыных калоніях –  гам.
Птушкі дружна вясну абуджаюць.
То, што трапіла ў дзюбы, – не хлам,
Гракі гнёзды з зімы аднаўляюць.

А шпакоўні, пустыя пакуль,
Вокам поўдзень блакітны цікуюць.
У дом родны, з-за сонца, адтуль
Іх крылатыя госці кіруюць.

Сонцапад рушыць снег, топіць лёд.
Вада грае, бурліць, нібы песня.
Ручаём плача снежны сумёт,
Журавы зноўку славяць прадвесне.

І ўжо ў Кінешме – скрозь капяжы.
Нейкі тыдзень на Волзе гасцюю,
А зіма так здала рубяжы,
Што я стрэльбу на гуся рыхтую.

Раптам бачу расквечаны сад.
Пах чаромхі над лесам лунае.
Бэз, акацыя…  Мой палісад
Чарадзейны парад прынімае.

Пачакай і каня не гані.
Час язміну яшчэ расквітнее.
У жыцця – усе звонкія дні,
Чарада іх – да зорак алея.

Маладосць – як прадвесне ў жыцці,
Дзень світання, зямлі адраджэнне.
Як бы міма вясны не прайсці:
Яна – наша святло і натхненне.

2009

БАЦЮХНА ДОН

**Дзікае поле**

1
Па Дону хвалі вецер узнімае,
На поле дзікае вясна прыйшла.
Казачка зноў на беразе старая,
Апошні раз тут сына абняла.

Яна даўно павыплакала слёзы.
Але пакуль Гасподзь ёй множыць дні,
Глядзіць яна ў спякоту і ў марозы,
Ці не відаць сыночка на кані?

Казацкі лёс – конь пад сядлом і шабля,
Начны дазор, трывожны сон застаў.
На свежай ране чырванее марля.
І вольны вецер каб не заціхаў.

Дванаццаць войскаў з казакоў стаяла
На межах рускіх гор, лясоў, раўнін.
Казацтва станавілася трывала
У чарназём, балоты, камяні.

"Імперыя" – так зваўся волат горда.
У згодзе жыў рабочы, селянін.
Казак за стол садзіў аж сто народаў,
Сваіх братоў. Усе – нібы адзін.

Заможна ў доме, хлеба ўдосталь, кветкі.
Дзяцей шануюць, старых і жанчын.
Людзей сумленных не хавалі ў клеткі.
І каравай, і боль – на ўсіх адзін.

А вольны вецер гоніць хмары з неба.
Яго блакіт так любіць атаман –
Хоць на хвіліну, а забыцца трэба,
Што дзесьці сілы множыць ураган.

У наваколлі яр не зарастае.
Усё бяжыць няведама куды.
Казак данскі заўжды рубеж трымае,
Заслона наша ад любой бяды.

На дзікім поле яр бярэ пачатак.
Па ўсёй Расіі безданню ляжыць.
Ён падзяліў жабрацтва і дастатак.
Казацкі круг свабодай даражыць.

Той яр разрэзаў сем’і і станіцы –
Нібы ў два колеры пафарбаваў.
Казацкі Дон Маскву сваёй сталіцай
Высокай граматай замацаваў

Быў час, у яр сышлі ўсе пастаралі,
І людзі палявалі, як ваўкі.
Казакі за ідэю паміралі,
За рускі плач – латышскія стралкі.

2
На дзікім полі звон вясны сваволіць.
Нясуцца раўчукі з усіх бакоў.
Над ярам першацвет квола ўзыходзіць,
Разбуджаны вясной пад стук падкоў.

Гарачы конь узнёсся над туманам.
Над шабляй нагала ўстае зара.
Казак ліхі стаць марыў атаманам,
Свой лад шукаў для роднага двара.

Не даспяваў ён песню аб прыволлі.
Казачку верную не дакахаў.
Расою травы плакалі на полі,
Калі казак на дзікі дол упаў.

Яго з сядла зняла чужая куля.
Страляў курэнь суседні, ды ва ўпор.
Не выйдзе больш за касагор матуля
Хлапца праводзіць у данскі дазор.

Дон праз людзей, падзеі, час праходзіць.
На дзікім полі ўсе яму радня.
Як люба казаку тут пры народзе
Пусціць галопам вернага каня.

Над краем змрок згушчае фарбы ночы,
Запоўніў неба, дол уздоўж ракі.
Толькі вада згарэўшы дзень не хоча
Справадзіць моўчкі ў цемру напрамкі.

Цяпло надзей і сонечных праменяў
Занатавала формула вады.
Яна – святла апошняе імгненне,
На дзікім полі вечнасці сляды.

Вада святлей, чым дол і неба ночы.
Світаннем новым зоймецца блакіт.
Яго, няхай толькі казак захоча,
Распаліць Дон ад чырвані ракіт.

А новы дзень – то новыя паходы,
Адлегласцей нязведаны маршрут.
Знаць, будуць зноў у казака турботы.
На дзікім полі нельга без пакут.

**Казачка Тамара**

1
На дзікім полі па-над ярам травы.
На хвалях іх красуе вольны край.
Казак данскі, ліхі і кучаравы –
За ўсе часы тут выдаўся ўраджай.

З яго зярнятка вырасла Тамара.
Казачка слухала наказ бацькоў.
У строгасці яе жыццё трымала:
Касіла, жала, пасвіла кароў.

Бабуля песні сумныя спявала
Пад гуслі доўгіх зімніх вечароў
Пра казака, якога пакахала,
А ён узяў з вайны і не прыйшоў.

Яго цярпліва ўсё жыццё чакала.
Дзяцей у віры часу зберагла.
Папрокамі жывым не дакучала.
Свой цяжкі крыж данесла да святла.

Тамарын прадзед, на сыноў багаты,
Заможна жыў, і ў тым уся бяда.
Чужы прытулак стане новай хатай
Сям'і замест радзімага гнязда.

Цагляны дом пяройдзе сельсавету.
А вецер разнясе дачку, сыноў.
Узнімуцца хлапцы на зайздрасць свету,
Каб на вайне пасля загінуць зноў.

Але казацкі дух не памірае.
Ва ўнуках, праўнуках яго працяг.
Гляджу, казак ліхі каня сядлае,
А вецер рве над ім вайсковы сцяг.

2
Тамара час сабе не выбірала.
Мужнела хутка, шчыраю расла.
Пайшла вучыцца. Доктаркаю стала
Без камсамола. З'ехала з сяла.

Яшчэ студэнткай прынялі ў Разані.
Прыгожы край ясенінскіх бяроз.
Але і сёння кліча на спатканне
Той дом, дзе дух яе казацкі ўзрос.

Мужчынам першым стаў, каго кахала,
Хто пад вянец употайкі павёў,
Бо ж партыя царкву не прызнавала.
Глыбокі яр між імі час правёў.

Яна на Бога крыўды не трымала.
А з партыяй – па розныя бакі.
Яе радня ў шляху толькі губляла,
Пакуль вялі натоўп бальшавікі.

Быў момант ісціны і ўсё расставіў:
Прымус, насілле – пройдзены этап.
Ды толькі дзіўна, на якой падставе
На мітынг новы строіць эскулап.

За сорак ёй. Казачка шпарка крочыць.
Што дні даюць, без мітусні нясе.
Дачка і сын за кожным крокам сочаць.
Вось муж адстаў дзесь на чужой красе.

Які ўжо час ён просіць прабачэння.
Гатоў нанова будаваць сям'ю.
Было б усё ж казачцы палягчэнне.
Гаворыць проста: – Здрады не цярплю.

Расслабіцца? Тут нельга нават думаць.
Не знізіцца напруга, не прасі.
Ды часам знойдзе ў шафе ізумруды
І на вакзал спяшае на таксі.

Экспрэс сталічны, інтарэс сардэчны.
Казачка з ім гуляе па Маскве.
Душа спявае, нібы ў шчасці вечным.
Ён не казак, ды іскра ў галаве.

Іграюць валасы яе раскошна –
Пад вольным ветрам дзікая трава.
А крочыць, як дзяўчо, – хіба так можна?
І горда ўзнята ўсюды галава.

На шпільках, што ад часу не адсталі.
У чым прыгожа, модна ёй усё.
Гады да стану нават не прысталі,
І не трымалі рукі век кассё.

Яе герой, хай нават ён і Джокер,
Ды на канцэрце ставіць у Крамлі
Яна на Джо: – Бясконца любы Кокер,
Ты самы дзіўны голас на зямлі.

І ўсёй сваёй празрыстаю істотай,
Да фанатызму ўзрушанай душой,
Яна спявае з жудаснай ахвотай
На мове спевака, як на сваёй.

Што ў зорны час казачка адчувала?
Які прастор адкрыўся ёй з Крамля?
Данское поле дзікае ўставала
Пад ветрам волі ў хвалях кавыля.

Якое свята! Ды прыходзіць рэдка.
Але Тамара поўная надзей,
Хай пасмяецца лішні раз суседка,
Нарвежскія фіёрды паглядзець.

Жаданні адмысловыя ў казачкі.
Паўночны край цяпер ёй падавай.
Ляціць на поўдзень люд лячыць балячкі,
А ёй паказаны суровы край.

Якім яе наступны выбар будзе?
Куды пакліча прага адкрыцця?
Не па загаду вольны вецер блудзіць,
Казачка поля дзікага дзіця.

2009

ВЫШЫНЯ

Ты на гады вядзеш адлік узросту.
Не ведаеш, куды жыццё брыдзе.
Я ж на маршруты мераю і вёрсты –
У паднябессе кліча новы  дзень.

Вяршыні гор у ледніках раздольных
Трымаюць сіні купал. Цішыня.
Вакол блакітна-белае прыволле.
Які абсяг, якая вышыня!

Дамбай – ты лепшая на свеце песня.
Ляжыць тут першы мой круты  маршрут.
Вучылі ўсе, ды толькі ты з прадвесня –
Галоўны мой,  вышэйшы інстытут.

У скалах крок – разлік і загартоўка.
Хай снегапад, мароз або дажджы –
Ідуць сябры, надзейная страхоўка,
І ледасек – мой посах назаўжды.

Яшчэ дзе стрэнеш вышыню такую,
Бляск ледніко‌ў, увесь блакіт зямны,
Убачыш мару кветак лугавую,
Дзе пасвяцца аблокаў табуны.

Пачуеш споведзь у гарах уцёса,
Пакратаеш далоняй небасхіл.
Ну а пасля на зайздрасць нават лёсу
За камень схопішся з апошніх сіл,

Каб утрымацца на краі абрыву.
І будзе новым святам узыход,
Калі, трымаючы вятры за грыву,
Распаліш знічкаю ў гарах усход.

А там, дзе траса і спявае Марцін,
Кафэ, пад’ёмнік і на лыжах – ўніз,
Адрэналін даюць па віннай карце…
А я ступіў на ледзяны  карніз.

Па  горных  схілах снежны барс крадзецца.
У  скалах ён палюе і жыве.
Па сцежцы звера выйсці давядзецца,
Інакш лавіна ў прорву нас сарве.

Гарыць усход над скаламі празрысты.
Трымайся, дружа, я  з табою, брат!
Вядзе вышэй, вышэй шлях камяністы,
А ля падножжа сціх крыжоў парад.

Дасталі сябра з бездані кашчавай.
Ішоў са мной у звязцы ён адной.
Крук не падвёў, падзелімся з ім славай.
Ідуць у горы з яснай галавой.

Дзесь вадапад з-за воблакаў ракоча.
Кружыць арол ніжэй, ка мне спіной.
Я з гэтай вышыні цяпер не збочу –
Там пасяліўся заўтрашні настрой.

Дамбай – ты песня лепшая на свеце.
Тут мой яшчэ не пройдзены маршрут.
Зноў ветразь рве блакітна-белы вецер,
І неспакой мне будзе – як салют.

2009

## ***БЕЛАРУСКІЯ СПАТКАННІ***

### ЧЫГУНКА

I

Раз’езд Лібава-Роменскай чыгункі…
Ля буды вадакачка. Між палёў
Цягнік на рэйках – дзіўныя малюнкі.
Раней такіх не бачыў Кашалёў.

Як лунь сівыя патрыярхі поля,
Гадоў сваіх згубіўшыя адлік,
Уцяміць не маглі, што ў наваколле
Да іх прынесла нейкі паравік.

Яны са страхам, жудасным здзіўленнем
Ніц падалі, спаткаўшы паравоз,
І Госпада малілі на каленях,
Каб д’ябла ў лес сухі з вачэй унёс.

Драўляны быт пад саламяным дахам:
Гумно, карова, конь, надзел зямлі.
Жыццё вяскоўцы ставілі з размахам,
Наколькі ўлада дазваляла ім.

І вось паблізу пралягла дарога.
Гудкамі абудзіла сон сялян.
Яна ў палі прыйшла з жыцця другога,
У небе там кружыў аэраплан.

А тут сялянскі графік не збіваўся:
Сяўба, пакос, жніво і халады.
Калі хто з баразны і адлучаўся,
Больш на вайну. І так было заўжды.

Стагоддзямі вясковыя навукі
Сталелі. Іх сівыя мудрацы
З плугамі разам маладым у рукі
Перадавалі, як ваду ў карцы.

Каб не праліць на дол ніводнай кроплі.
Да мазалёў у поце іх збіраў
Зямляк на буда-кашалёўскім полі.
Пад Польшаю, Літвой яго араў.

Еўропа за свабоду нас разносіць,
Драбнейшых пагаліўшы пад шаблон.
А Беларусь і герб, і сцяг свой носіць,
І я на роднай мове  шлю паклон.

II

Чыгунка несла ўсё хутчэй падзеі.
Ход набіраў і ў вёсцы махавік.
Быў цар, паны, бядняк і багацеі,
Прыйшлі Савет, калгас і бальшавік.

Залічваць час пачаў і мне адлегласць –
Прайшоў свой дол я ўпоперак і ўдоўж.
Дняпро на захадзе мяжой пралегла,
Рубеж на ўсходзе засланяе Сож.

Пейзаж радзімы: селянін і вёска,
Наўкол палі, лясы і зноў палі.
На сенажацях разнатраўе ў росах,
На ніве колас гнецца да зямлі.

Духмяны перазвон палёў за хатай.
Напоены ім ізумруд лясоў.
Дубы люляюць бег часоў у шатах
Пад вечны гімн птушыных галасоў.

Калі сакрэтаў на раллі не стала,
Я быў на «ты» і з плугам, і з касой,
Чыгунка стукам колаў падказала:
– Ляжыць працяг за жытняй паласой.

Наш родны кут, яго не выбіраюць,
А з місіяй зямной Багі даюць.
Мы толькі шлях пад сонцам пачынаем,
А нам з яго не збочыць, не звярнуць.

Дубровы парадзелі, я прыкмеціў,
Тут дзед мой колісь клёпку выrабляў.
Пад шатамі дубоў у ліхалецце
След партызан бясследна прападаў.

Атрад бясшумна на чыгунку выйшаў.
Гарэлі танкі тысячай кастроў.
Бой лозаўскі ў гісторыю запішуць –
Так біў фашыстаў Пеця Мацюшкоў.

З руін зноў трэба вёсцы паднімацца.
«Вам засланіць яе чарод настаў,
Ад ворагаў адкрытых, ад данайцаў», –
Мне Лаўрыновіч строга наказаў.

III

З раённага маштабу выраслалі
Стратэгі і ўраджаяў, і прываг.
Артысты, мастакі, паэты сталі
З майго кутка выходзіць на прасцяг.

Яны на паласе сваёй жыццёвай
Збіраюць, як вучылі, ураджай.
Нібы па рэйках крочаць, па сталёвых,
Ім выдаваў мандат сялянскі край.

Ён, як раней, пра хлеб надзённы дбае.
Наперакор Чарнобылю жыве.
І выхаванцаў горнам аклікае,
Радком у кнігу памяці заве.

Я летапіс твайго жыцця чытаю.
Занатавана многа ў ім сыноў.
У авангардзе – зорка залатая,
Герой-знішчальнік, наш Галавачоў.

Вякі-старонкі, прозвішчы, імёны.
Аўраменка, Андрэенка і Дрозд.
Мастак Майсеенка, нібы іконы,
Свае палотны ў свет па рэйках вёз.

Стараннем, працай, талентам, натхненнем
Сыны і дочкі гартавалі лёс.
Былі героі, мужнасць і гарэнне,
А ўвесь цяжар сялянскі вывез воз.

Героі нівы Жукаў, Кірыленка.
Іх прозвішчы – з падручнікаў жыцця.
А колькі пазабыта акрыленняў…
Ну вось Ягор Картавенка хаця б.

Яго атара па вясне прынесла
За іншых больш на ўвесь раён ягнят.
Аэраплан старога ў паднябессе
За той рэкорд даставіў. Вось быў хват!

А Сёмчанка Іван – салдат разведкі.
Ён на чыгунцы ў час вайны рабіў.
І партызанам выдаваў даведкі –
Што фрыц на рэйкавай вайне згубіў.

Гісторыяй, багаццямі славуты
Краіна, горад, вёска, чалавек.
Лепш абышлі б мой край усе пакуты
І на сяброў багатым быў бы век.

Я ведаю, кут родны, тваю мару.
Ты хочаш шчасце вымяраць людзей
Не нафтаю і газам, як пачвары,
А колькасцю народжаных дзяцей.

Ад буды кашалёўскай стала звацца
Зямля, дзе нарадзіўся я і рос.
Сюды я буду зноў і зноў вяртацца,
У твой блакіт і цішыню бяроз.

2008

# ЖЛОБІНСКАЯ ВЯСНА

I

Лясны Рабкор, чыгуначны тупік.
На Рудабелцы ён здаўна ў пашане.
Адсюль заўжды штоноч хадзіў цягнік,
На ім у горад рушылі сяляне.

Маршрут ляжаў да Жлобіна тады,
Як і цяпер, расклад не памяняўся.
Сталелі мы, раслі і гарады.
Сялянскі край таксама абуджаўся.

Араты вечны з болем пакідаў
Бацькоўскі дом па закліку газеты.
Заводы, фабрыкі ён будаваў,
У світку саматканую адзеты.

На рыштаваннях дух займала, жах!
Патрыярхальныя дрыжалі гены.
Глядзець баяцца вочы на размах,
А рукі клалі будучыні сцены.

З Рабкора не ўсялякі пасажыр
На цягніку да Жлобіна дабраўся.
Сышлі ў Бабруйску. Іншы на Сажы,
У Гомелі, там ставіць дом узяўся.

А хто білет да Жлобіна купіў,
Таксама без рэкордаў не застаўся,
На прыстані ён, у дэпо рабіў –
Так горад на Дняпры рос і ўзнімаўся.

Яшчэ з маленства памятаю я,
Што станцыя здаўна тут вузлавая.
З бабуляй, з маці і адзін пасля
Шукаў, дзе на Рабкор цягнік чакае.

Яго аўтарытэт народ цаніў.
Мяне настаўнік павучаў, без смеху:
– Ты б транспарцір у Жлобіне купіў,
Калі з канікул ад бабулі ехаў.

Вядома, у вясковы магазін
Не везлі нам вучнёўскія прылады.
Набыць да школы ўсё быў шанц адзін –
У горадзе. І выбар там багаты.

II

Гісторыі ходу не затрымаць.
Другая справа – ад жыцця не збочыць.
Пачаў і Жлобін з вёскі вырастаць,
Сумленна ён хацеў у заўтра крочыць.

Ён не зайздросціў важнасці сталіц.
З набыткам сіл сваіх рабіў прагнозы.
Да сонца рваўся, бы вада з крыніц,
Праз вецер злы, спякоту і марозы.

Так, трэба нам за ўсё ў жыцці плаціць.
У Жлобіна таксама ёсць рахунак.
Каб горад прыгажэць мог і расці,
Далейшы лёс звязаў са штучным футрам.

У самай зорнай справы плямы ёсць.
Праект завода ад сусветных знаўцаў.
Замежны будаўнік быў майстар, госць.
Да нас прывёз ён вірус д'ябла зайцам.

За права жонкай, маці быць, сястрой
Стаў нелюдзь бойка тут збіраць даніну.
Пайшлі на торг каханне і настрой,
Нядаўняя сялянка – сэксрабыняй.

Навошта майстраваць нам дабрабыт?
Навошта ў эканоміцы развага?
Імперыя зыходзіць у нябыт,
Калі аддаць жанчыну на знявагу.

Губляе без яе свой сэнс жыццё.
Яно мужнее  і расце ад маці.
Пакуль смяецца на руках дзіцё,
Настане заўтра на раллі і ў хаце.

Нам не пазбегнуць на шляху ахвяр.
Насуперак вар'яцкаму закону
Бабуля горда выйшла на бульвар
З унучкаю гуляць, нібы  ікона.

Святлейшы шлях, пралёг ты дзе ў жыцці?
І кемлівасць патрэбна, і здароўе,
Каб у сям'і да старасці дайсці.
А горад зноў распачынаў будоўлю.

Гігант металургічны вырастаў.
Для новых гараджан прыйшла работа.
Цягнік жа мой хадзіць не перастаў,
А жыць прыгожа кожнаму ахвота.

Прырода, праўда, крыўдзіцца цяпер,
Дым едкі шкодзіць гораду нямала.
Плаціць патрэбна чымсьці за давер,
За чысціню дняпроўскага металу.

У пекле печаў металічны груд,
Аджыўшы век, вяртае кошт, значэнне.
Зноў попыт мае жлобінскі маршрут.
Ён гонар горада, яго сумленне.

III

Сялян былых не вернеш на зямлю,
І Жлобін – станцыя іх канцавая.
А я тут перасадкі ўсё раблю,
Як толькі ў родны кут душа спяшае.

Спатканню новаму бясконца рад.
Дарэмна час тут людзі не гублялі.
Палацы там, дзе дваццаць год назад
Дняпроўскія звінелі пастаралі.

Час пэндзалем грунтоўна маляваў:
Уздоўж Дняпра – праспект, кругом бульвары.
Здаецца, тут раней і не бываў.
Насустрач – гараджан вясёлых твары.

З ракі данёсся пошчак салаўя,
Бабулю, бачу, яго спеў кранае.
Магчыма, аднакласніца мая –
Зарэцкая, ну як цябе пазнаю?

Жартуе май, ён фантазёр, мастак –
Скрозь кветкі, фарбы, карагод птушыны.
Сваволіць так, што расшпіліў свой фрак
Асілак металургіі краіны.

Куды ён сан свой строгі падзяваў
І з парушэннем розных пратаколаў,
То неба на арэлях калыхаў,
То цягнікі праводзіў пад стук колаў.

На беразе табун ён коней стрэў.
І, асядлаўшы скакуна, са свістам
Панёсся скрозь кіпенне майскіх дрэў,
Праз водар, дым, над трубамі навіслы.

Узняўся ён над хвалямі Дняпра.
Рака цячэ прывольна і шырока.
Я ўпершыню  з вагоннага акна
Параніў аб яе душу глыбока.

Як горад вырас і прыгожым стаў!
Я, быццам па Еўропе, тут гуляю.
Кур’ерскі, Бацькаўшчына, твой састаў
Час марна на прыпынках не губляе.

Шчаслівы горад радасных людзей.
У вокнах, асляпіўшых само сонца,
Я твары бачу заўтрашніх дзяцей
Скрозь май і дым, маральны кодэкс, стронцый.

Зачараваны я тваёй хадой,
Зачараваны лепшай гараджанкай:
Мне колісь стала назаўжды вясной.
Шкада, што размінуліся мы ранкам.

За вас я рады і за ваш прагрэс.
Аднак пара на трасу праз завулак.
Машынай правіць новы інтарэс –
Я еду да вясны шукаць прытулак.

2009

СЯРЭБРАНЫЯ КЛЮЧЫ

I

Буслы вясну вітаюць клекатаннем:
«Дамоў вяртанне» – птушак паланез.
Я да жанчыны еду на спатканне
На пах чаромхі, у палескі лес.

Разлік, карысць, выгода тут не ў планах.
Адлегласці і справы – не ў разлік.
Вядзе маршрутам прама ў храм спатканняў
Маё юнацтва, быццам праваднік.

Дзе стрэцца нам, мы доўга не шукалі.
Шмат краснах месц пад вільчыкам гадоў.
Мы кропкай рандэву дзяцінства ўзялі,
Дзе пачынаўся старт нашых хадоў.

Гульня пайшла без права пераносу.
Падказкі, загатоўкі – не для нас,
Бо за мяне ніхто на ўскрайку лёсу
Не праспявае мой вясне раманс.

Сярэбраным ключом туманаў ранніх
Наводшыбе ад шумных гарадоў
Вясна нам адчыніла храм спатканняў
Пад водарам абуджаных садоў.

Бязлітасна май фарбай дол расквеціў.
Палітрай сыпаў ён ва ўсе бакі.
Бярозавай лістотай занавесіў
Блакітны небасхіл, разліў ракі.

Вярба дадолу звесіла галінкі
Узорамі святочных абрусоў.
З зялёных струн спадае без супынку
Мелодыя птушыных галасоў.

Сімфонію нясе май адмыслова,
Музыкам падпявая лес густы.
Сам салавей вядзе ў аркестры сола,
Сярэбраных ключоў птах залаты.

II

Настрой вясновы захапіў кабету:
Вішнёвы водар, водар яблынь, груш.
Нагбом вясну п'е за мяжою свету
Гасцінны домік з палісадам руж.

Дом разнасцежыў вокны і ўсе дзверы
І ловіць промні сонечных дажджоў.
Пашкодзіць не баіцца ён шпалеры –
Ружовы б звон у палісад прыйшоў.

Праз час, шыроты і мерыдыяны
Мая далонь на валасах тваіх.
Мы розныя з табой, два акіяны,
Спакой адзін шукаем на дваіх.

Забытыя пачуцці нагадаем.
Гараць яны вясёлкай сярод хмар.
Вясна задор юнацкі нам вяртае
На хвалях смелых і агністых мар.

Яны шырока па жыцці панеслі,
Наперад пільна мусілі глядзець.
Мы не хацелі падаць з хісткіх лесвіц,
Курс выбіралі, каб не чырванець.

Не чырванець за зломаныя лёсы,
За недавер падманутых людзей,
Агрэхі на сяўбе, жніве, пакосе,
За пустату няздзейсненых надзей.

Мінулае ад зайздрасці рагоча:
– Былі кватэра, сын, законны муж.
Былі і ёсць. Аднак жанчына хоча
Уласны домік з палісадам руж.

III

Бярэзіна нясе блакіт раздольна.
Даўно цячэ, няведама адкуль.
Чаромха пабяліла наваколле –
Яна дзяжурыць па вясне пакуль.

Бэз у чарзе на варце каляровай,
Парфумай шчодра кветкі надзяліў.
Каштаны да ўрачыстасці гатовы,
Падпаляць, часам, свечкамі разліў.

Развешаны  ў маёвым небе зоркі.
На чоўне месяц выплыў на дазор.
У сінім змроку дальнія пагоркі –
Вясной да краю поўніцца прастор.

Ты над ракою мне раманс спяваеш,
Нібы сакрэт сардэчны выдаеш:
Каго героем сёння называеш
І ў палісад ружовы павядзеш.

За словамі, што льюцца з тваіх вуснаў,
Пачуццяў глыбіня і страты боль.
Мне вартасці назвала, звычкі, густы,
Да стомленай душы сваёй пароль.

Ды я спазніўся – за грахі расплата.
Гадам людзей няма хады назад.
Ёсць мне ў тваім жыцці адна пасада –
Садоўніка ў ружовы палісад.

2009

## ШКОЛЬНЫ АРКЕСТР

Сустрэча выпадковая ў дарозе.
Мой школьны сябра, дзе ты і адкуль?
Спяшаешся дадому, па трывозе?
Я бачу, ты яшчэ ў страі пакуль.

Палала наша першая сустрэча
Асеннім лісцем школьнага двара.
Збор піянерскі, камсамольскі вечар –
Вясковая сталела дзетвара.

Усе мы, хлапчукі, дзяўчынкі, – вучні,
І толькі з іх нямногія – сябры,
Якія не давалі клятвы гучнай,
Але стаялі за цябе ў двары.

Мы толькі сябру давяралі тайны.
Цаною ён плаціў табе двайной.
Мяне агеньчык з ім яднаў патайны.
Сябры раслі трываласці адной.

На ўсю сцяну вісела ў класе карта.
Не ведала яна яшчэ маршрут,
Які мы пракладзём ад школьнай парты
Праз зарыва салютаў і пакут.

З героямі раманаў мы сталелі.
Прайшлі за марай тысячы дарог.
Спагадліва настаўнікі глядзелі,
Калі нас выпраўлялі за парог.

Ліміт дзяцінства выбрала патрошку –
Не дапаможа дзённік запасны.
Каханне першае, званок апошні.
Нам баль рукой махае выпускны.

Юнацва капітал падсумавала:
Сямнаццаць год – як ветразі мае,
Максімалізму мара падпявала,
І школьны дружа веры надае.

Жыццё сваё мы шчыра будавалі.
Чужой не закрываліся спіной.
У твар нягоды, поспехі пазналі.
І вось унукі цягнуцца за мной.

Здаецца нам, што выйшлі з лабірынта,
Што шлях далей па роўнаму вядзе.
І сябру без або са шклянкай спірту
Не сорамна мне ў вочы паглядзець.

Аркестр іграе школьны так зайздросна:
Нам салютуе наш шчаслівы час,
Дзе мроямі ўстрывожаныя вёсны.
Мы з браткам сёння разбудзілі вас.

2010

# *НА ЗАЛАТЫМ ГАНКУ*

## РАДАСНЫ КРАЙ

Без дорогі – не вандроўнік.
Вам з Італіі пішу.
Чым хвалюе край чароўны
Нашу рускую душу?

Загарэлы, быццам лета,
Мне спагеці падае.
Бач, Рамэа для Джульеты
Зорку з неба дастае.

Бураціна пазнаеце?
І ён з радаснай зямлі.
Усе дзеці на планеце –
Дружбакі яго былі.

Ці ж да сну – звіняць куплеты
Серэнады пад акном…
Тут гісторыя планеты
Пачала хаду даўно.

Выбірала месца строга,
Шанц адзін ёй час даваў.
Сонца-край абжыты Богам,
Рымлянін не адставаў.

Нават бомж тут мазгавіты –
З ім увесь на колах скарб.
Калізей вось знакаміты,
Побач горбіцца арба.

Час настаў падсілкавацца.
Справы – потым, перш – за стол!
Страва – Бог у італьянца,
Як царква, ну і футбол.

Бомж агонь расклаў у скверы,
Тут грунтоўна ён асеў.
Адчыніў у быт свой дзверы
На паказ – зайздросце ўсе.

Бачу я, глядзяць турысты.
Столькі ўсякага дабра
Захаваў куток гарысты –
Можна снедаць ля кастра.

2009

БІЛЕТ НА КАРНАВАЛ

На падмурках старажытных
Ад усёй зямлі дары.
З Македоніі, Егіпта…
Свае знатныя майстры.

Леанарда, так, да Вінчы,
Рафаэль… Як многа іх.
Дойлід той – сам Бог антычны.
Я, уражаны, прыціх.

Што прывезлі, што зрабілі –
Параскладзена радком.
Важна, памяць не згубілі,
Не адправілі на злом.

Рым – гісторыя жывая.
А Фларэнцыя – мастак.
Над Венецыяй лунаюць
Мары і анёл, іх знак.

Нават блудныя Пампеі
Адкапалі з-пад руін.
Там жылі не ліхадзеі,
Ну хіба сеньёр адзін.

Пад блакітным небам бачу,
Як музеі, горады.
Сустракаюцца няўдачы.
Выйсце тут знайшлі з бяды.

Пра Венецыю вядома –
Мора горад заліло.
Гандальерам – еўра, долар,
Гараджанам – адно зло.

Ёсць каму там разабрацца.
Я ж хадзіў, глядзеў, гадаў,
Чаму Бродскі тут застацца
Назаўсёды пажадаў.

Ён спакой знайшоў тут вечны,
Лаўрэат, інтэлігент.
Жорсткі свет – ён вершы, свечкі.
Хіба ж гэта аргумент?

Як Венецыя гарэла –
Карнавал так баляваў.
Я пад маскай кабальера
Да світання прагуляў.

Ну а ў Пізе, паглядзелі б,
Вежа вось-вось упадзе.
Не гаруюць чарадзеі,
Брак за цуд у іх ідзе.

Аб'явілі ўсяму свету.
Ён паслухаў званароў.
Гледачоў на гэту вежу
Цяпер больш, чым жыхароў.

Трэба талент мець, майстэрства,
Каб цікава расказаць,
Як пад сонцам рымскім цесна.
Я – далей, сваіх шукаць.

Горкі тут пабыў на ўзмор'і –
Ён здароўе папраўляў.
Апенінскае нагор'е
Гогаль наш аблюбаваў.

Я за ім спрабую крочыць –
Напішу, пасля спалю.
Разам жыць ён нам прарочыў,
Не дзяліў людзей, зямлю.

Анненкаў – мастак вядомы.
Браў сюды, назад білет.
Не вярнуўся ён дадому.
Тут паўсюдна рускі след.

Мне з партрэта цар Пётр Першы
Ратслумачыў гэта так:
– Мы ў Еўропу выйшлі спешна,
Вось не спынімся ніяк.
2009

## НА ЗАЛАТЫМ ГАНКУ

Крыжаносцы неслі веру
Ва ўсе закуты зямлі.
З боем браліся бар’еры,
Тэрыторыі раслі.

Чулі над Дняпром бярозы –
Навальніцы дзесь гулі.
Ішлі ў Рым з дабром абозы,
Неслі скарбы караблі.

Паўз  бяссонныя дарогі,
Уздоўж сініх берагоў
Абуджалася адгор’е.
Расла веліч гарадоў.

Над капэлаю Сіксцінскай
Час ад часу ўецца дым.
Ватыкан шле з Богам міласць
Састарэлым, маладым.

Пад скляпеннямі палаца
На спатканне я іду
З часам, лёсамі. Прызнацца,
Дыялог з жыццём вяду.

Італьянскія старонкі
Для дарослых і малых –
Нам усім палёт высокі,
Бачым свет душой святых.

Ён, расселены па залах,
Размаўляе з дзетварой.
Ля палотнаў, не ў падвалах,
Яна чэрпае настрой.

Сонца на шчаслівых тварах,
У вачах гарыць запал.
Пачынаюць з рымскай мары
Хлапчукі душы напал.

Іх на ўрокі па мастацтву
Прывязлі з усіх шырот.
Не жыве там святатацтва,
Дзе няма чужых сірот.

З залатога ганка бачу,
Чым свет цешылі гады.
На што я жыццё патрачу?
Дзе ж маёй сяўбы плады?

2009

# ВОГНЕННЫ ШЛЮБ

Пасад так многа ў Старажытным Рыме,
Вясталка не апошняю была.
Агонь свяшчэнны сцераглі жанчыны,
Згараючы нярэдка ў ім датла.

I

Руіны наўкол.
Тут Форум: людзей
І Богаў прастол.
Храм Весты – далей.

Багіня ачаг
Глядзела. І Рым,
Каб ён не ачах,
Душу ўсю – святым.

Жар грэе далонь
З часоў тых, калі
Важней быў агонь,
Чым серп, – для жняі.

І кемных дзяўчат
Не ў поле вялі,
Яны ў бляску шат
Агонь бераглі.

Свяшчэнны ачаг –
Жар рымскіх надзей.
З ім нават у снах
Патрыцый, плебей.

II

У вогненны шлюб
На трыццаць гадоў
Дзяўчынку пашлюць
Па згодзе бацькоў.

З заможнай сям'і,
Твар, думкі – узор.
Узрост – год сямі.
Быў жорсткі адбор.

Ёй – беленькі ўбор,
Амата – імя.
У храме касцёр
Не гасне ні дня.

Захоўваць ачаг –
Яе рамяство.
Агонь у вачах
І жыць хараство.

На золаце Рым
У жаркі палон
Нёс лепшым дары
І нізкі паклон.

Іх вернасць адну
Прасіў узамен.
Рым ведаў цану
Крутых перамен.

Хаваў ад усіх
Вясталак народ.
Спакусам да іх
Закрыты ўваход.

Бясшлюбнасць – зарок
Дзіцяці дала.
На здраду знарок
Яна б не пайшла.

Аж трыццаць гадоў
Быць жрыцай агню,
Без палкіх хадоў
І лёс на кану.

Дарогу назад
Аднялі ў жанчын.
Агонь без іх страт –
Нібы без лучын.

Іх подзвіг – цяжар
Для цела, душы.
Бязлітасны жар
Паліў рубяжы.

III

Дарога адна
Вясталак вяла.
Спявала вясна,
Мімоза цвіла.

Нявіннасць душы
І дум чысціня.
Бар’еры крышыў
Каханы штодня.

Забыты наказ.
Давала зарок?
Свяшчэнны экстаз…
Далей – толькі змрок.

Каханы на здзек
Вясталку паслаў.
Слабы чалавек.
Касцёр жа палаў.

Вялікай не стаць –
Там час, чысціня.
Ну што шкадаваць.
Даруе радня.

З пашанай у склеп
Насілкі плывуць.
Пантыфік – услед.
І нельга звярнуць.

Жывой у зямлю
Ля смутных варот
Вясталку сваю
Адпусціць народ.

**IV**

Ну як папрасіць
Сваю маладосць
Пачуцці спаліць –
Нязваны то госць.

Пяшчоту хвілін
Глыбока схаваць
Да лепшых часін,
Каб потым дастаць.

Праз трыццаць гадоў
Бег спыніцца ўраз.
Няма ні акоў,
Ні гнеўных абраз.

Шчаслівы канец,
Ды страчана шмат.
Спяшаўся ганец.
Спазніўся ты, брат.

Пранесліся сны
Раскошых палат.
Чужыя сыны
Трымаюць парад.

Рым ведаў цану
На жаркі ачаг.
Дачку не адну
Звёў, каб ён не счах.

Свяшчэнны агонь:
Лячыла цяпло
Ад здрад і пагонь.
Рым рос на святло.

2009

## *МАЗАІКА РАЗБУДЖАНЫХ ГАДОЎ*

### РАСТУЦЬ У ГЛЫБІНЮ КАЛОНЫ

Прасолены прыбоем
Ляжыць ля ног блакіт.
Вітае нас з настроем
Гарачы краявід.

Пад сонцам млее Пафас –
Герой сівых былін.
У профіль, у анфас ён,
Бясспрэчна, з тых часін.

Антычная сталіца,
Кругом сляды руін.
Мінулым ганарыцца
Мастак сівых карцін.

Углыб ідуць раскопкі,
Узрушана зямля.
Сваёй душы асколкі
Здае нам спакваля.

Былое пад нагамі:
Падмуркі, чарапкі.
Дрыжачымі рукамі
Зграбаем з іх пяскі.

Растуць у дол калоны,
Растуць у глыбіню.
Адтуль час спапялёны
Зноў рвецца ў вышыню.

Каб праз вякі паведаць,
Як Павел, наш святы,
За веру, запаветы
На здзек пайшоў круты.

Халодная калона,
Пад ёй – апостал сам.
Шчыруе кат натхнёна.
Удзячны свет  майстрам.

Яны змуруюць вілу,
Палац, што люба ўсім,
Для караля – магілу.
Час многае прасіў.

Ля Петра ту Раміу
Нястомна біў прыбой.
Ён рваўся, колькі сілы,
Да славы незямной.

І востраву на дзіва,
На бераг залаты
Багіня Афрадзіта
Сышла з марской вады.

І на зямлі прыгожай
Атабарыўся рай.
Да гор, да іх падножжа,
Скрозь – маляўнічы край.

У квецені адгор’е
І вёскі ўздоўж дарог.
Партрэт куткоў узмор’я
Глядзіць на нас з падлог.

Стаміўся археолаг.
Гусцее над ім змрок,
З руін жыцця былога
Зграбаем мы пясок.

Па кроплі адраджаем
Чужых часоў сляды.
Мазаіку складаем
Шчаслівых дзён, бяды.

2009

# НА СОНЕЧНЫХ АРЭЛЯХ

Кароль Ільвіным Сэрцам горда зваўся.
З мячом сам Рычард у нядаўні час
Марскім пейзажам жорстка захапляўся.
Тут нарабіў слядоў яго абцас.

I

Маскоўскае скупое лета змоўкла.
З вятрамі восень рвецца на пастой.
А я на Кіпры залатым алоўкам
Спрабую жніўня нагадаць настрой.

Асколкі фарбы звонкага зеніту
Імкнуся кіпрскім кіпенем злучыць.
Жаданне паўтараю, як малітву,
Што ўсёй маёй істотаю крычыць.

Мне словы ў справы трэба пераплавіць.
Каб мару-казку явай Бог зрабіў.
У пошуках у мора хачу правіць.
Ды вось чырвоны буй мяжу адбіў.

Зямлю і неба рыска гарызонту
Рашуча падзяліла папалам.
Кранаю тут рабінавую гронку,
Сцюдзённай нематы пустэча там.

II

Пад сонцам Кіпр пакрыла пазалотай:
Гісторыю, прастору і мяжу.
На востраве і ў верасні спякота,
І я над морам раніцу буджу.

Як свята, сонца з хвалі вырастае.
Яму насустрач я на ўсход плыву.
Мая рука дыск вогненны кранае,
Што я зусім губляю галаву.

А сонца ў неба ўсё вышэй няслося,
Памножыўшы ў вадзе гарачы лік.
Я залатое рэжу шматгалоссе
Вады і ветру пад птушыны крык.

Па моры хвалі коцяцца нястомна.
Адна адну спрабуюць перагнаць.
А я, шукальнік слоў да песень новых,
У гонцы верх хачу ў азарце ўзяць.

Вада мяне не то што зневажае,
Ёй некалі валтузіцца са мной.
У пеннай хвалі місія другая –
Не сціх бы над зямлёй марскі прыбой.

Вада наўкол хвалюецца і б’ецца.
Запоўніла да гарызонту свет.
І мне лагодна так у твар смяецца:
– Хоць што знайшоў у бездані, паэт?

І пеннай хваляй шчодра накрывае.
Гуляецца са мной, бы з немаўлём.
Баранчыкамі смешна забаўляе…
Ды гэта ж жартачкі з самім агнём.

Фантазія ў стыхіі – на здзіўленне!
Палітры не шкадуе для абноў.
То сінюю сукеначку адзене,
То б’ецца фіялетавым радном.

Я ізумруднай кропляй акварэлі
На хвалі ўверх лячу, затым – уніз.
Нясуся, бы на сонечных арэлях, –
Такі зайздросны выпаў мне круіз.

Высока як, але не ў кіламетрах,
Багаццяў шмат, але не ў кашальках.
На сэрцы, на душы – жыцця адмета,
Трапеча шчасце быццам бы ў руках.

Раптоўна штормам гарызонт парвала:
Між небам і зямлёй няма граніц.
Тут чалавеку шанцаў вельмі мала
Сярод бяздоння ўзяць смяртэльны бліц.

III

У рэчаіснасць буй мяне вяртае.
Пастаўлены ён лінію трымаць.
За ёй дзесь момант ісціны блукае,
Ды небяспечна буй пераплываць.

Я правілаў усё жыццё трымаўся –
Па іх вучыўся, марыў, працаваў.
Калі ж дзе над мяжою і ўзнімаўся,
Мне спачувалі: – Ты ж рызыкаваў.

А колькі я знаходзіў у палёце,
Якi ад курсу раптам адступаў.
Пачуццяў, веры, куражу ў рабоце…
Але выдатнік верх рашуча браў.

Як першакласнік, самы паслухмяны,
На ваўчар свой з надзеяю гляджу.
Я столькі чуў прарокаў палымяных,
Аднак па крузе ўсё хаджу, хаджу.

Як комплекс мне выдатніка парушыць,
Каб межы забароны перайсці.
Што, зноў я адступлю і моўчкі струшу,
Артыкул толькі б выгадны знайсці.

IV

Сезон на Кіпры бархатны  ў разгары.
Каханне, прыгажосць б’юць цераз край.
Цяпла, святла тут звыш усякай мары.
Буй па жывому рэжа гэты рай.

Тут інтарэс турэцкі пралягае.
З другога боку грэчаскі бяжыць.
Пра тых і гэтых Нікасія дбае –
Як без сталіцы востраву пражыць?

Павінны з ёй лічыцца англічане.
Іх базу дрот калючы абкруціў,
З ёй голуб міру прыляцеў з туманаў –
Так Альбіён гняздо на Кіпры звіў.

Край старажытны, ён мудрэў з гадамі.
Знайшоў адгадак столькі для людзей.
Прыйдзі ў наш дом, і будзь шчаслівы з намі –
Спрадвек вітаў Алімп усіх гасцей.

Сярод руін, раскопаных паселішч,
Схаваўшых тайны старажытных сноў,
Мазаіка далёкіх наваселляў
На свята нас гасцінна кліча зноў.

Сустрэчы новай тут заўсёды рады
У час любы, і так за годом год.
Мазаіка жыцця ідзе парадам
Праз буй чырвоны і калючы дрот.

Каменьчыкі рука з пяшчотай склала.
Легенды на падлозе ажылі.
Мазаіка праз змрок занатавала
Каштоўнасці, што сонца бераглі.

2009

ЗБАВЕННЕ

Стыхія Афрадзіту нарадзіла,
Яна на бераг з пенных хваль сышла.
Багіня прыгажосці свет здзівіла,
Узор кахання людзям падала.

Сярод зайздрасці, здрад і смагі,
Багіня, ты нясеш глыток надзей –
Каханне стане сімвалам адвагі,
Калыскаю народжаных дзяцей.

Ва ўсе часы гламурна на Алімпе.
На густ любы забаву выбірай:
Каханне, шопінг, казіно, малітвы,
Музыкам ноччу зорнай падыграй.

А хочаш, у віне шукай натхненне,
Каб жыць прыгожа і не шкадаваць,
Што яхта не твая нясе збавенне
На востраў, дзе не хочуць нараджаць.

2009

МІРАЖ

На жаль, канец ёсць і ў чароўных казак.
Ну што паробіш, я сабраў багаж.
Патоне пад крылом Ларнака разам,
І ў хвалях знікне залаты пейзаж.

На бераг з морам развітацца крочу.
У хвалі скінуў стому, груз дарог.
Каб новае спатканне напрарочыць,
Капейкі еўрапейскія збярог.

Маю даніну хвалі падхапілі.
Яны любой валютай даражаць.
Па курсу шчасця людзі разлічылі,
Якой манетай мору аддаваць.

Быў наш раман кароткі, але бурны
Наводшыбе ад крымінальных зон –
Тут толькі трыста чалавек у турмах.
Над Кіпрам чую развітальны звон.

У небе сонца жарам налівае.
Спякота поўніць кіпрскі краявід.
А мора промні песціць, калыхае,
У кроплях множыць вогненны балід.

Даліна сонечная… Як раздольна!
Вада люляе казачны прастор.
Па ім ідуць дзве постаці павольна
Законам фізікі наперакор.

У марыве здаліся сілуэты:
За імі бачу яшчэ рускі Крым,
Высокі дуб стаіць насупраць лета,
Бярозка маладая побач з ім.

Спрабую распазнаць, хто так мажорна
Па прамянях кіруецца ў блакіт.
Ды гэта ж мы ў вясельным падарожжы
З Таццянай крочым праменька ў зеніт.

На жаль, канец ёсць і ў чароўных казак.
Ну што паробіш, я сабраў багаж.
Патоне пад крылом Ларнака разам,
І ў хвалях знікне кіпрскі мой міраж.

2009

СУМЛЕННЕ

На беразе святкуюць днём і ноччу.
Заліў аддаў гасцям увесь блакіт.
Цяпла і сонца – колькі хто захоча,
А вось тапчан уранні – дэфіцыт.

І чытачы тут – большасць на ўзбярэжжы.
Патрэбны ім хаця б адзін паэт,
Які ад сытых думак незалежна
Будзе з сумленнем свой вастрыць санет.

У час, калі няўтомна ў хвалях бурных
Наш творца музу верную шукаў,
Якісь баул, на выгляд ён культурны,
Яго тапчан нахабна так украў.

Ніхто не бачыць – гэта вельмі зручна.
Чужыя рэчы – прэч! Замест – свае,
Для поўнага камфорту. Так выключна
Адзін ён на адзін заўжды жыве.

Якая проза? Факт зусім не ў рыфму.
Ці варта пра пачвару – прама ў верш?
На курсе караблёў бываюць рыфы.
Ты што, паэт, сваіх не пазнаеш?

Яны на тэлекамеры гатовы
Пра подзвігі геройскія свае
Бясконца мовіць, горача, грунтоўна.
Сумленне ім такі карт-бланш дае.

З трыбуны сходу для высокай світы
Пра важнасць дзей уласных гаварыць
Яны вам будуць палка і адкрыта,
Пакуль чырвоным мікрафон гарыць.

А сам на сам, такі настане момант,
Калі сумленне сведка і суддзя,
Яно адно. І ты – міфічны волат,
І круціцца з табой твая Зямля.

І ты пад тайнай сховай адзіноцтва,
Далей ад позіркаў чужых вачэй,
Сабе дазволіш у душы банкроцтва –
Тваё сумленне топчацца ніжэй.

Вось кукіш у кішэні на заўвагу,
Якую справядліва заслужыў.
На спіну плюнеш генію ў знявагу –
Той подлае нутро разварушыў.

Ад зайздрасці да поспехаў суседа
Яго карове апетыт звядзеш.
І ў край, дзе круглы год спявае лета,
Сумленне паслухмянае вязеш.

Яно на людзях, з выгляду, прыстойна
У справах, у адзенні, у ядзе.
Калі ж адно – ганебнасці адстойнік,
З табой нахабнай шкодніцай брыдзе.

2009

# *АСЕННЯЯ МІЛАСЦЬ*

## АСЕННІ НАСТРОЙ

У медным зарыве алеі з клёнаў
Асенні разгараецца настрой.
Ужо надзеі лета спапялёны,
І восені ніхто не дасць адбой.

На вахту шумна дворнікі выходзяць.
Ліст кружыцца, марудзіць ападаць.
Паненка восень знатна карагодзіць,
Спрабуюць з ёю мётлы ваяваць.

Але пажар барвовы не сціхае.
З ім клопаты ўчарашнія гарацьь.
Па шыбе дождж дакучлівы сцякае.
У вырай восенню гады ляцяць.

Я, шахматы расставіўшы, ад рання
Пад яблыняй у золаце сяджу.
У сонечным настуджаным убранні,
Не заўважаю, як і дзе хаджу.

Унук малы святкуе перамогу.
Мне будзе мат праз два хады ўсяго.
Ліст падае на медную падлогу,
І доўга-доўга кружыць звон яго.

2009

ЧУЖОЕ ЛЕТА

Хвалюецца пад ветрам
Наліты жытні колас.
Жняя зразае лета
Сярпом. І  чуе голас.

То просіцца зярнятка
Жывой вады напіцца.
Пад небам хоча братка
Зноў коласам схіліцца.

Дажджам на змену – просінь.
Шчыруе сейбіт лоўка.
Спагадлівая восень –
Не па гадах сяброўка.

Патухлі фарбы лета.
З дажджамі асцярожна
Асеннія прыкметы
Заходзяць пераможна:

У золкія світанні,
У сумныя прасторы.
У нашы спадзяванні
Не зведаць сцюжу гора.

Мне з восенню спатканне –
Нібы з табой сустрэча.
Квітнела наша ранне,
Набег раптоўна вечар.

І мы ў абшар барвовы
Да часу падаліся.
Свет клікаў каляровы,
А мы ў імжу нясліся.

Цягнік гукае хуткі.
Сяўба азімых руліць.
Спазніўся аж на суткі
Цябе я прыгалубіць.

Зязюля кукавала –
То быў чужы рахунак.

Вясна падаравала
Апошні пацалунак.

Балючы ён і горкі
Узімку, у спякоту.
Патухла ў небе зорка,
Аддаўшы ўсю пяшчоту.

Да часу спеюць людзі
І падаюць з арбіты.
Іх сход не  замарудзяць
Ні лекі, ні малітвы.

Напал чужой карысці
Душы трывожыў сховы.
Ляціць пажоўклым лісцем
Наш першацвет ружовы.

Па восені гуляю,
Як некалі з табою.
Ліст кружыць, ападае,
І мне  няма  спакою.

На выцвілыя скроні,
На стомленыя плечы
Асенняя пагоня
Схілілася сардэчна.

Я чую голас родны
З вясны той развітальнай.
Які ж ён быў халодны
Пакойчык твой шпітальны.

Над коўдраю зялёнай
Азімага палетка
Крылаты клін стамлёны
Імкне ў чужое лета.

Цяжарны дол хлябамі,
У марах ён асенніх,
Сагрэе рунь снягамі
Да раўчукоў вясенніх.

2008

АСЕННЯЯ МІЛАСЦЬ

Маё піянерскае лета…
Як вулей наш лагер гудзе.
Прайшло паўстагоддзя, і гэта –
Куток для знямоглых людзей.

Цяпер ён завецца курортам.
Ёсць статус, а зместу няма.
– Як лагеру можна за бортам? –
Хвалюецца восень сама.

Асфальт рэжуць травы густыя,
Бянтэжыць разбураны быт,
Бур’ян лезе ў вокны пустыя –
Наш лагер ляціць у нябыт.

На рэштках куточак адбілі –
Прытулак для ціхіх старых.
Высокую шыльду прыбілі –
Удзячнасць бацькам маладых.

Іду піянерскай сцяжынкай.
Мяне не пазнаў дзікі кут.
Далёкай маленькай іскрынкай
Я калісь адсюль вёў маршрут.

У танцах кружылася ўзлессе,
І ночы палалі ў кастрах.
Да воблакаў несліся песні
Аб школе, радзіме, сябрах.

Праз шыбу акна нас з атрада
Гукаў лёс у промні зары.
З рамантыкай разам загады
Сабе аддавалі сябры.

Надзейна, з настроем, упарта,
Умелі прыгожа мы жыць.
Дзіця піянерскага гарту
Не здрадзіць, былым даражыць.

І вось па дарозе замінка,
Пракралася лісам да нас.

Па рэйках ляцім без супынку,
Ды бачу… Зялёны пагас.

Звініць піянерскае лета,
Як вулей наш лагер гудзе.
Куды ты нясешся, планета?
Я ж столькі не здзейсніў надзей.

Апошнія кветкі з-пад лісця
Чырвоным так жарка пякуць.
Пуцёўка – асенняя міласць,
Старому даўгі аддаюць.

Фінальная песня не спета.
Ідуць аднагодкі мае
З віхрастага сіняга лета.
Ідуць, ды вось сэрца здае.

Зайшло піянерскае лета.
Як вулей наш лагер гудзеў.
Імчыць у бязмежжа планета
Сваіх састарэлых дзяцей.

2008

## МАРЫЯ ВАСІЛЬЕЎНА
### Паэма

Усім настаўнікам прысвячаецца

I

З нязменнай вахты на хвіліну збочыў.
Короткі выдаўся прыпынак мне.
Каторы год я асвятляю ночы,
Кашуля аж намокла на спіне.

На скронях пыл з дорог планеты нашай.
У хаце на Палессі іх выток.
Я п’ю настрой зямлі тут поўнай чашай.
Спатканне з домам – новых сіл прыток.

Сасновы бор. Бярозы, што на ўзлеску,
Які салодкі ваш гаючы сок!
Ты, Рудабелка, – бы жыцця пралеска.
Мы разам прараслі праз пясок.

Міленіум Зямля сустрэла ўзнёсла —
На яхтах не стаялі за цаной.
У прыцемках заснежаная вёска,
Дрымучы лес далей стаіць сцяной.

Ёй не ўсё роўна, дзе блукаюць вёсны.
Тут мала адбылося перамен.
Схавалі на гарышча пранік, кросны,
Забыты ёўня, калаўрот, бязмен.

Без шуму вёска ціха памірае,
Спагады ёй няма адкуль чакаць.
Сядзібы, вуліцы пазарасталі,
І галасоў дзіцячых не чуваць.

Час дробязей такіх не заўважае.
Касмічных велічынь ён уладар.
На ўзбочыне жыцця, пакуль жывая,
Вось-вось пакіне вёска
стромкі шар.

II

Шаша, чыгунка, паварот направа,
У вочы хата сумная глядзіць.
Марыя і Ўладзімір каля брамы –
Сівая пара тут заўжды сядзіць.

На лаўцы каля плота іх прытулак.
У доме тэлевізар – там туман.
А вось вясковы кінуты правулак
Адзін з жыццём звязаў старых сялян.

Даўно сядзяць, дзявяты ім дзясятак.
Раней у працы бавілі свой час.
Васільеўна вучыла нас заўзята,
А гаспадар – шафёр на ўвесь калгас.

Настаўніца нам мову выкладала,
Ён, па жыцці, – патомны хлебароб.
Сям'я сялянскі лёс спаўна пазнала.
Дастатак быў, здараўся недарод.

Той хлеб і веды, што яны давалі
Аднавяскоўцам сціпла, ад душы,
Іх землякі на росны дол вярталі
Станкамі, збожжам, стужкаю шашы.

Цяпер яны на ўскрайку ў сваёй вёсцы:
Па мудрасці, узросту – ды кругом.
Яны бліжэй да лесу, на палосцы,
Бо крайнім стаў па вуліцы іх дом.

Не страцілі пакуль да сонца прагу.
Не згублены запал душы, настрой.
Ды сіл няма з ранейшаю адвагай
Трымаць з айчынаю адзіны строй.

Але ж пра ўсю акругу вам раскажуць:
Дзе, хто, адкуль і што, куды нясе.
Усе падзеі да драбніц узважаць,
Што пракурор так лоўка не ўтрасе.

III

Дазор вясковых мудрацоў не томіць.
Хвіліна ёсць – на лаўцы ўжо сядзяць.
Ім бессань час для справы эканоміць.
Хіба крыху навіны паглядзяць.

Дзесь на людзей нахлынула цунамі.
Курс долара расце, бы на дражджах.
Рубель жа ў іх цяпер які? Драўляны.
Ім вёска спачувае: – Гэткі жах!

Пад пляск ды скокі вешаюць Хусэйна.
А вінаваты толькі ў тым, відаць,
Што не хацеў ён пад дыктоўку Сэма
Яму ўсю нафту ну дарма аддаць.

Каб на людзей журбу і страх наводзіць,
Зноў клоуны з’язджаюцца ў Давос.
Яны замест рэальных спраў узводзяць
З хлусні тут пірамiды да нябёс.

А ваўчар той? Агіда, здрада веку:
Жыццё і лёс мільёнаў – пад каток.
За што такое кола чалавеку?
Яго чырвоным называў прарок.

Дэфолты, крызісы зямлю страсаюць…
– Няма здароўя на пачвар глядзець.
Заразу гэту выключы, старая.
Куды пілюлі ты магла падзець?

Адны нягоды, колькі іх адразу…
Ці ёсць на свеце хоць які спакой?
Стары прыняў навіны за абразу,
Палаяўся, падаўся ў свой пакой.

Натопіць раніцай у хаце жарка.
Дзень новы прынясе і хлеб, і квас.
На снеданне – паронкі, сала шкварка.
Гэта пакуль ёсць сілы і запас.

Сусед даўно кукуе ў інтэрнаце.
Прытулак там для іх, сірот зямных.
Васільеўна ж клапоча ў роднай хаце
І хоча тут застацца да труны.

Вады прынесці, накарміць, дагледзіць –
Адным старым нялёгка дажываць.
Тут нават сонца, бач, няроўна свеціць.
Ну хто нябозе стане спачуваць?

Ён – не артыст, бабуля – не палітык.
Гэта за тых прывыклі галасіць
З газет, экранаў: – Гвалт, куміры зніклі.
І шоу ставяць, каб бабла скасіць.

Вясной, як снег, іх растаюць запасы.
Цяплей, святлей, хаця і менш пакут.
Былі б у краме цукар, хлеб, каўбасы –
Не зарасце сюды зямны маршрут.

IV

Настаўніца мая па роднай мове
Святкуе, робіць да такой пары
Рукамі вучняў. Іх, на добрым слове,
Не распазнаць з вясковай дзетвары.

Вучоны, дэпутат, выдаты токар,
Пілот, той сейбіт – ну мастак араць.
Славуты аграном, вядомы доктар.
А родным хатам трэба паміраць…

Яны, бы здані, у зямлю ўрастаюць
І сіратліва клічуць сваякоў.
Відаць, цяпер ужо не нагадаюць,
Калі пад дахам чулі мужыкоў.

Як у жыцця ўтрымацца хоць на краі?
А калісь тут ішоў яго парад:
Званок са школы рэха паўтарае,
Тры магазіны, пошта, зернесклад.

На станцыі грузілі лес звыш плана.
То тут, то там свяціўся новы зруб.
А ўвечары – культурная праграма:
Сустрэць цягнік – нібы схадзіць у клуб.

Ад батарэі радыё спявала.
А Станілевіч ставіў нам кіно:
Бы свята, перасоўка прыязджала,
І адчынялася ў Сусвет акно.

Сярод палескіх прыцемкаў, балотаў
За крокам крок ішлі мы да святла.
Ты, вёска, мне прыступкай залатою
Для выбару галоўнага была.

Малюнак яркі захаваў з дзяцінства:
Для аднагодкаў у любой сям’і
Была смачнейшаю за ўсе гасцінцы
Буханка хлеба ў рукі на дваіх.

Чарга сама нярэдка вырашала,
Каму апошні бохан аддаваць.
Духмянага ўсім шчасця не хапала.
Зноў самалёты «ЛЕНИН»ым ляцяць.

З Бабруйска слова гэтае ўзляцела
(Адтуль у вёску хлеб вазіў цягнік) –
Так армія савецкая хацела,
Каб правадыр у памяці не знік.

Не шкадаваў сябе край партызанскі
Дзеля свабоды – мы яго сыны.
Данёс Максім мне праўду па-сялянску:
– Так, перацерпім, не было б вайны.

У доме мы яго кватаравалі,
Пакуль чакалі ордэр на жыллё.
Мяне далей нясуць дзяцінства хвалі,
У вір кідаюць бэзавым галлём.

V

Гульню ў вайну вялі мы цэлай вёскай
І ведалі баёў крывавых пах:
Зямлянка, дзот, акоп, а я – у касцы,
І аўтамат не цацачны ў руках.

І па-сапраўднаму сяброў хавалі.
Іх смерць знайшла на мінах той вайны,
Дзе нам бацькі дастатак здабывалі.
Аблокі ў небе мчаць, як скакуны.

О, як хацелі мы да іх узняцца,
Без павадоў праз ростані ляцець,
Трывожыцца, чакаць і захапляцца,
Па-добраму зайздросціць і сталець.

Пасля сапраўдных коней мы сядлалі
І з іх зляталі, быццам з круч, на дол.
Хто выжываў, у пуні начавалі.
Так на даросласць бралі мы дазвол.

Дзяцінства фарбы, водары і мары…
Па кветцы мы збіралі свой букет.
Гулі завеі, неслі сцюжу хмары,
А я спяшаўся за святлом услед.

Марозны дзень, гараць ад ветру шчокі.
На лыжах мы нясёмся ўніз з гары.
Якім бы снег ні быў зімой глыбокім,
Сняжынкі ён на шапках дзетвары.

Рамантыка кастроў, што выйшла з шортаў:
Горн піянерскі, вогненны начлег…
Па іскрах іх на ўсіх зямных прасторах
Звяраем мы да зор няспынны бег.

Канікулы. Як чэрвень красаваўся!
Выдатнікам – пуцёўка, ды ў Артэк.
Змей папяровы горда ў неба рваўся,
Як самы смелы будучы праект.

Мы ў лесе дні і ночы прападалі.
Чарніцы там, арэхі і грыбы.
За іх на кніжкі грошы выручалі.
Вось так раслі – я і мае сябры.

«Лясны пажар сунялі вучні мужна» –
«Раёнка» так паведала пра нас.
А мы ахвотна ўсё рабілі, дружна.
І шырыўся ў вачах зямлі акрас.

Усход малінавы заліў паўнеба.
Душу вярэдзіць ландышаў букет.
Мне выпадкова Таню стрэціць трэба,
Бы майскага кахання першацвет.

Зноў восенню садзіліся за парты.
У верасня асобны каларыт.
Ён клёнам залатым глядзіць упарта
У вочы нам да гэтай аж пары.

Яшчэ палеткі з бульбаю без краю –
Рэкорды ставіў кожны год калгас.
Такога край не ведаў ураджаю.
У марыве асеннім знік наш клас.

Капалі бульбу вучні ўсяе школы –
Асушаных балотаў важкі дар.
Праславіў многіх ён у наваколлі.
Так рос, мужнеў айчыны гаспадар.

VI

У далечы касмічнай, між сузор'яў,
Час місію глабальную нясе.
Зямлянам, калі мы вядзем узорна,
Імгненні выдзяляе пакрысе.

Здараецца, што нас абходзяць вёсны.
У пекле войнаў палім мы сябе.
Непрадузяты час да нас, не злосны.
Ён проста шанц аднойчы дасць табе.

Яго адняць у нас імкнуцца злыдні,
За ўладу і багацце змагары.
Калі ў мяне апошняе аднімуць,
Хай гэты свет у полымі гарыць.

І ён гарыць: то тут, то там палае.
Рабы ідуць – бязлітасны іх бунт.
Таксама Рудабелка не маўчала:
Згарэла колькі ў полымі пакут!

Мой край палескі люта помсціў катам.
Сцяжынка партызанская вяла
Праз гушчары, дрыгву і перакаты,
Праз стогны вёсак, спаленых датла.

… Ратміравічы ціха аджываюць,
Аддаўшы сілы і душу сынам.
У вёску тыя рэдка наязджаюць.
Яна пакуль спраўляецца сама.

І крыўды на сыноў зусім не мае,
У згодзе толькі б родныя жылі.
На свеце столькі вогнішчаў палае.
Глядзі, сынок, свой твар не абпалі.

І злых людзей хай побач будзе меней,
Трывогі абыходзяць твае сны...
Штодня бярыце шчасце поўнай мерай.
Жывіце лепш, чым я, мае сыны.

А будуць дзеці – вырастуць унукі.
У памяці іх вёска стане жыць.
Салодкія нам настальгіі мукі,
Тады ці варта аб былым тужыць?

2009

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЕ ВЫДАННЕ

Калінічэнка Валерый Іванавіч

НА ЗАЛАТЫМ ГАНКУ
Вершы. Паэмы.

Рэдактар М.М. Чарняўскі.
Тэхнічны рэдактар А.Я. Крычаўцоў.
Камп’ютарны набор Г.М. Харашылава.
Мастак Г.В. Мяркулава.
Дызайн і кам’ютарная вёрстка Н.Н. Назарова.
Карэктар А.С. Пятрова.

ИПО "У Никитских ворот"
121069, Москва, ул. Большая Никитская, д.50а/5, стр. 1
Телефон: 8 (495) 690-67-19 www. uniki.ru